Голас Радзімы

№ 17 (1743)
29 красавіка 1982 г.

ГАЗЕТА БЕЛАРУСКАГА ТАВАРЫСТВА ПА КУЛЬТУРНЫХ СУВЯЗЯХ З СУАЙЧЫННІКАМІ ЗА РУБЯЖОМ
(БЕЛАРУСКАЕ ТАВАРЫСТВА «РАДЗІМА»)

Выдаецца з 1955 г.
Цана 4 кап.

Амаль УСМАН прыехала вучыцца ў Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію з далёкага Судана. Заняткі па лесагадоўлі, якія праводзяцца на трэцім курсе землеўпарадкавальнага факультэта, заўсёды выклікаюць у дзяўчыны павышаную цікавасць. А калі што бывае незразумелым, побач з ёю беларускія аднакурснікі.
Фота В. ДРАЧОВА.

падзеі • людзі • факты

ПАМЯЦІ У. І. ЛЕНІНА

22 красавіка ў Крамлёўскім Палацы з'ездаў адбылося ўрачыстае пасяджэнне, прысвечанае 112-й гадавіне з дня нараджэння У. І. Леніна. Тут сабраліся перадавікі і наватары вытворчасці сталіцы і Падмаскоўя, ветэраны партыі, прадстаўнікі партыйных, савецкіх і грамадскіх арганізацый, дзеячы навукі і культуры, воіны Савецкіх Узброеных Сіл, касманаўты. Прысутнічалі замежныя дыпламаты, зарубежныя госці.

У прэзідыуме — кіраўнікі партыі і ўрада краіны на чале з Генеральным сакратаром ЦК КПСС, Старшынёй Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР Л. І. Брэжневым, а таксама Генеральны сакратар Кампартыі Чылі Л. Карвалан, Генеральны сакратар Кампартыі Аргенціны А. Фава.

Урачыстае пасяджэнне адкрыў член Палітбюро ЦК КПСС, першы сакратар МГК КПСС В. Грышын.

З дакладам «Ленінізм — невычарпальная крыніца рэвалюцыйнай энергіі і творчасці мас» выступіў член Палітбюро ЦК КПСС, старшыня Камітэта дзяржаўнай бяспекі СССР Ю. Андропаў. Прамоўца адзначыў, што, паводле думкі У. І. Леніна, самае буйное праяўленне дэмакратыі — гэта ў асноўным пытанні аб вайне і міры. Праблемы міру самым непасрэдным чынам звязаны з абаронай карэнных сацыяльных інтарэсаў працоўных. Іменна так іх заўсёды разглядалі марксісты. Так разглядаюць іх сёння ўсе камуністы-ленінцы. Савецкія людзі высока цэняць мужную барацьбу брацкіх партый супраць вайны, за мір, бяспеку і сацыяльны прагрэс. КПСС, верная свайму інтэрнацыянальнаму абавязку, рабіла і будзе рабіць усё, каб умацоўваць у гэтай барацьбе салідарнасць і супрацоўніцтва са сваімі зарубежнымі таварышамі па класу, садзейнічаць дасягненню больш цеснай згуртаванасці камуністычнага руху на прынцыповай марксісцка-ленінскай аснове.

Наша знешняя палітыка, як і ў часы Леніна, прадстаўляе нашы мірныя інтарэсы ў адносінах да ўсіх краін і народаў свету. Ад гэтага ленінскага курсу мы не адступім ніколі.

У Мінску 21 красавіка ў тэатры оперы і балета БССР адбыўся ўрачысты сход, прысвечаны гэтай знамянальнай падзеі. На ім былі кіраўнікі Кампартыі і ўрада рэспублікі на чале з кандыдатам у члены Палітбюро ЦК КПСС, першым сакратаром ЦК КПБ Ц. Кісялёвым. У дзень 112-й гадавіны з дня нараджэння Уладзіміра Ільіча Леніна, 22 красавіка, кіраўнікі Кампартыі Беларусі і ўрада рэспублікі ўсклалі ў Мінску на плошчы, якая носіць імя вялікага правадыра, кветкі да яго помніка.

Былі ўскладзены таксама кветкі ад генеральных консульстваў Польскай Народнай Рэспублікі і Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі ў Мінску.

З ВІЗІТАМ У БЕЛАРУСЬ

СЯБРОЎСКАЯ СУСТРЭЧА

Кандыдат у члены Палітбюро ЦК КПСС, першы сакратар ЦК КП Беларусі Ц. Кісялёў прыняў 23 красавіка члена Прэзідыума ЦК СКЮ, саюзнага сакратара па народнай абароне СФРЮ генерала арміі Н. Любічыча, які знаходзіўся ў Савецкім Саюзе з афіцыйным візітам.

Адбылася гутарка, якая прайшла ў цёплай, сяброўскай атмасферы. У ёй прынялі ўдзел начальнік грамадзянскай абароны — намеснік міністра абароны СССР генерал арміі А. Алтунін, камандуючы войскамі ЧБВА, генерал арміі Я. Іваноўскі, а таксама пасол СФРЮ ў СССР М. Арландзіч і іншыя афіцыйныя асобы.

ПА ЗАПРАШЭННЮ ЧЫРВОНАГА КРЫЖА

Па запрашэнню выканкома Саюза таварыстваў Чырвонага Крыжа (ТЧК) і Чырвонага Паўмесяца СССР горад-герой Мінск наведала аб'яднаная дэлегацыя таварыстваў Чырвонага Крыжа Венгрыі і Чэхаславакіі. Госці азнаёміліся з дзейнасцю ТЧК рэспублікі, якое сёння налічвае ў сваіх радах больш за 4,5 мільёна чалавек, пабывалі на Мінскім трактарным заводзе, наведалі таксама адзін з дзіцячых садоў горада і рэспубліканскі шпіталь інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны.

САЛІДАРНАСЦЬ З НАРОДАМ НАМІБІІ

У Мінску пабывала дэлегацыя Народнай арганізацыі Паўднёва-Заходняй Афрыкі (СВАПО) на чале з намеснікам сакратара Народнай арганізацыі Паўднёва-Заходняй Афрыкі па міжнародных сувязях, членам ЦК СВАПО Ааронам Шыхепа.

У медыцынскім інстытуце адбыўся мітынг салідарнасці з патрыётамі Намібіі. У выступленнях яго ўдзельнікаў гучалі заклікі ўмацоўваць дружбу з народамі, якія змагаюцца супраць апартэіду і расізму, за сваё нацыянальнае вызваленне.

Дэлегацыя СВАПО пабывала ў вытворчым трыкатажным аб'яднанні «Прагрэс». У Беларускім таварыстве дружбы і культурнай сувязі з зарубежнымі краінамі адбылася гутарка з актывістамі Беларускага рэспубліканскага камітэта абароны міру.

Дэлегацыя СВАПО наведала таксама Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны і мемарыяльны комплекс «Хатынь».

НА ЗДЫМКУ: дэлегацыя СВАПО ў Мінску.

ПРЫЁМЫ

У ГЕНЕРАЛЬНЫМ КОНСУЛЬСТВЕ ПНР

З выпадку 37-й гадавіны польска-савецкага Дагавора аб дружбе, супрацоўніцтве і ўзаемнай дапамозе, які стаў гістарычнай вяхой у жыцці двух народаў, генеральны консул ПНР у Мінску А. Возьняк наладзіў 19 красавіка прыём, на якім былі намеснік Старшыні Савета Міністраў БССР М. Кавалёў, сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР Л. Чагіна, адказныя работнікі ЦК КПБ, кіраўнікі міністэрстваў і ведамстваў рэспублікі, прадстаўнікі партыйных, савецкіх і грамадскіх арганізацый Мінска, военачальнікі, актывісты Беларускага аддзялення Таварыства савецка-польскай дружбы. У час прыёму выступілі генеральны консул ПНР у Мінску А. Возьняк і міністр замежных спраў БССР А. Гурыновіч.

КОСМАС

У ПАЛЁЦЕ «САЛЮТ-7»

У Савецкім Саюзе зроблен запуск арбітальнай навуковай станцыі «Салют-7», мэтай запуска якой з'яўляецца працягванне навукова-тэхнічных даследаванняў і эксперыментаў, праводзімых на савецкіх пілатуемых комплексах у інтарэсах навукі і народнай гаспадаркі. У ходзе палёту будзе таксама праводзіцца адпрацоўка ўдасканаленых сістэм і апаратуры арбітальных станцый.

УЗНАГАРОДЫ

ГАНАРОВАЯ ГРАМАТА «ВЯСЁЛЦЫ»

За актыўную работу па камуністычнаму выхаванню дзяцей часопіс «Вясёлка» ўзнагароджан Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета Беларускай ССР.

Рад супрацоўнікаў і няштатных карэспандэнтаў часопіса, работнікаў друкарні выдавецтва ЦК КПБ узнагароджаны Ганаровай граматай і Граматай Вярхоўнага Савета Беларускай ССР. У іх ліку — пісьменнік Васіль Вітка, галоўны рэдактар часопіса Уладзімір Ліпскі, друкар Генадзь Жук і іншыя.

ПРАПАНАВАЛІ ВУЧОНЫЯ

ДЛЯ ПАТРЭБ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ

Комплексную навуковую сістэму вядзення ўсіх галін сельскагаспадарчай вытворчасці для саўгаса «Дрыбінскі» распрацавалі вучоныя Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі. У ёй выкладзены рэкамендацыі па ўнясенню ўгнаенняў на кожнае поле, распрацавана структура кормавытворчасці, складзены рацыёны для ўсіх відаў і груп жывёлы, вызначаны шляхі вырашэння іншых праблем.

Такія комплексныя сістэмы вучоныя распрацоўваюць для дванаццаці калгасаў і саўгасаў Магілёўскай вобласці, якія для акадэміі з'яўляюцца базавымі. На прыкладзе іх будуць вучыцца гаспадарыць усе земляробы Прыдняпроўя.

Летась навуковыя работнікі акадэміі атрымалі 33 аўтарскія пасведчанні на адкрыцці і вынаходствы. За год у вытворчасць укаранёна 28 навуковых распрацовак, агульны эканамічны эфект ад якіх склаў паўтара мільёна рублёў.

МІГРАЦЫЯ З СЯЛА Ў ГОРАД —

З'ЯВА ЗАКАНАМЕРНАЯ І НАТУРАЛЬНАЯ

РОЎНАЯ ЯКАСЦЬ ЖЫЦЦЯ

Дзе жыць — у горадзе або вёсцы? Многія мільёны людзей у нас у краіне задаюцца гэтым пытаннем, і больш чатырох з палавінай мільёнаў чалавек штогод, зрабіўшы выбар і прыняўшы рашэнне, пускаюцца ў дарогу з сяла ў горад або з горада ў сяло.

Змяніць асяроддзе існавання — справа не менш рызыкоўная і псіхалагічна цяжкая, чым, скажам, змяніць прафесію або абзавесціся сям'ёй. Па сутнасці, чалавек крута мяняе асабісты лёс. А ў выніку ад гэтых індывідуальных, сугуба асабістых рашэнняў, узятых у сукупнасці, у немалой ступені залежыць і лёс краіны.

Цяпер ідзе другі дэмаграфічны спад, узнікшы ў выніку падзей саракагадовай даўнасці. Вядома, што перамога над германскім фашызмам дасталася нашаму народу дарагой цаной — дваццаць мільёнаў чалавечых жыццяў. У 40-х гадах упала нараджальнасць, а к канцу 70-х гадоў адпаведна зменшыўся прыток людзей, якія ўступаюць у актыўнае жыццё. Скарачэнне прытоку працоўных рэсурсаў — адзін з фактараў, што ўскладняюць сённяшняе эканамічнае развіццё краіны. Прамысловасць, будаўніцтва, словам, гарадская сфера працы зведвае ўсё больш вострую патрэбу ў рабочых руках. Фактычна адзінай крыніцай папаўнення гарадскога кантынгенту работнікаў стала вёска. Але ж і вёсцы патрэбны рабочыя рукі.

АБ ЧЫМ ГАВОРЫЦЬ СТАТЫСТЫКА!

На 1 ліпеня 1981 года насельніцтва СССР дасягнула 267,7 мільёна чалавек, з іх каля 98 мільёнаў — сельскія жыхары. Сельскагаспадарчае насельніцтва, гэта значыць працуючыя ў калгасах і саўгасах разам з утрыманцамі, дзецьмі, пенсіянерамі і г. д., складае 63,7 мільёна чалавек. Непасрэдна ў аграрнай вытворчасці занята больш 24 мільёнаў чалавек.

Дзесяць гадоў назад суадносіны гарадскога і сельскага насельніцтва выглядалі інакш: 243,9 мільёна (СССР у цэлым) раўняецца 138,8 (горад) плюс 105,1 (вёска).

Сельскае насельніцтва, як бачым, сапраўды скарачаецца, але не таму, што яго натуральны прырост змяншаецца. Нараджальнасць у вёсках, як правіла, вышэй, чым у горадзе, смяротнасць і там, і тут аднолькавая, а працягласць жыцця сельскіх жыхароў не ніжэй, чым у гарадах. Скарачэнне сельскага насельніцтва — вынік міграцыі.

У 70-х гадах у горад штогод перасяляліся з вёсак амаль па 3,1 мільёна чалавек, сустрэчны паток — прыкладна па паўтара мільёна. Такім чынам, гадавое сальда міграцыі складала 1,6 мільёна чалавек.

У выніку сельскае насельніцтва, нягледзячы на актыўны натуральны прырост, зменшылася за дзесяць гадоў на 7 мільёнаў чалавек, а кантынгент занятых у аграрным сектары эканомікі скараціўся на мільён работнікаў.

Навукова-тэхнічны прагрэс, павышэнне прадукцыйнасці працы ў сельскай гаспадарцы (у 1976 — 1980 гадах на 15 працэнтаў) кампенсавалі вёсцы страты ў рабочай сіле. Але ці ў поўнай меры?

Увогуле кажучы, скарачэнне кантынгенту занятых у сельскай гаспадарцы пры адначасовым росце вытворчасці — паказчык інтэнсіўнасці развіцця краіны. Савецкі Саюз пакуль не дасягнуў тых прапорцый у размеркаванні рабочай сілы паміж галінамі, якія характэрны для краін з высокаразвітай прамысловасцю і сельскай гаспадаркай, і таму міграцыя з вёскі ў горад — з'ява заканамерная і натуральная. Практычна ўсе савецкія спецыялісты сыходзяцца на тым, што: 1) гэты працэс не спыніць, 2) яго можна і трэба рэгуляваць, спрабуючы зменшыць інтэнсіўнасць прыкладна ў паўтара раза (аптымальнае сальда — 1 мільён чалавек у год) і, нарэшце, 3) адзінага падыходу да вырашэння гэтай праблемы ва ўсіх рэгіёнах краіны быць не можа.

ГЕАГРАФІЯ ДЭМАГРАФІІ

Шчыльнасць сельскага насельніцтва ў розных рэспубліках вельмі розная. Напрыклад, у аазісах Сярэдняй Азіі яна дасягае 150—200 чалавек на квадратны кіламетр, ва ўрадлівай і цёплай Малдавіі — 70, на Украіне і ў Беларусі — 20—30, у рэспубліках Прыбалтыкі — 10—20, а ў абжытых зонах Сібіры і Далёкага Усходу — 3—5 чалавек.

Такія ж неаднолькавыя і тэмпы натуральнага прыросту сельскага насельніцтва. Скажам, на Украіне або ў Расіі сельская сям'я, што мае трох-чатырох дзяцей, лічыцца многадзетнай, а шасцёра-сямёра дзяцей ва ўзбекскай сям'і — з'ява звычайная.

Найбольш удалыя ў дэмаграфічных адносінах рэгіёны краіны — Эстонія і Латвія, большая частка Украіны, Малдавія, еўрапейскі поўдзень Расійскай Федэрацыі (стэпы па берагах Кубані, Дона і Церака), Закаўказзе, поўдзень Казахстана, а таксама наваколлі такіх буйных гарадоў, як Масква, Ленінград або Алма-Ата. Вёскі гэтых месц, аддаючы частку сваіх жыхароў гораду, амаль поўнасцю кампенсуюць страты рабочай сілы за кошт іншых рэгіёнаў. Колькасць сельскага насельніцтва дзе-нідзе змяншаецца, а дзе-нідзе нават узрастае, але ў дапушчальных межах.

Іншая карціна ў Чарназёмнай і Нечарназёмнай зонах Расійскай Федэрацыі, у Літве, некаторых абласцях Беларусі, Паволжа, Урала, Сібіры, Паўночнага Казахстана. Тут далейшы адток з вёскі непажаданы, ён можа прывесці да расходавання дэмаграфічных рэсурсаў і ў канчатковым выніку да зніжэння тэмпаў росту сельскагаспадарчай вытворчасці. Найбольш неспрыяльны раён — расійскае Чарназем'е. За дзесяць гадоў яго сельскае насельніцтва скарацілася з 4,7 да 3,7 мільёна. Для невялікага рэгіёна (усяго 3 працэнты насельніцтва краіны) гэта многа, калі ўлічыць, што за гэты ж адрэзак часу сельскае насельніцтва ўсёй краіны зменшылася на 7 мільёнаў.

На процілеглым дэмаграфічным полюсе — рэспублікі Сярэдняй Азіі, асабліва Узбекістан, Таджыкістан і Туркменія: павелічэнне колькасці насельніцтва вядзе да лішняй рабочай сілы ў калгасах і саўгасах. Зразумела, канстытуцыйнае права на працу, прадубліраванае да таго ж і ў статутах калгасаў, прадугледжвае поўнае забеспячэнне занятасці пры любых умовах, але высокая шчыльнасць сельскага насельніцтва ў рэспубліках Сярэдняй Азіі надзвычай абцяжарвае аптымальнае рашэнне гэтай складанай праблемы.

ШТО ПАКАЗВАЕ БАРОМЕТР МІГРАЦЫІ!

Аналіз міграцыйных працэсаў другой палавіны 70-х гадоў у параўнанні з першай паказвае, што ў цэлым сітуацыя пачынае мяняцца да лепшага.

Спрыяльныя зрухі назіраюцца ў Нечарназёмнай зоне РСФСР. Пасля таго як пачала рэалізоўвацца агульнадзяржаўная мэтавая праграма комплекснага развіцця сельскай гаспадаркі гэтага рэгіёна, у кожнай з 29 адміністрацыйных абласцей і аўтаномных рэспублік расійскага Нечарназём'я абсалютны адток сельскага насельніцтва зменшыўся, знізіўся працэнт міграцыйных страт.

У сярэдзіне 70-х гадоў колькасць прыязджаючых у Сібір перавысіла лік ад'язджаючых. Палепшылася становішча ў сібірскай вёсцы.

Рэзка скараціўся адток насельніцтва з Беларусі. Выезд людзей з Сярэдняй Азіі перавысіў уезд.

Як бачым, перамены закранулі найбольш слабыя ў дэмаграфічных адносінах рэгіёны, хоць і нельга лічыць, што міграцыйныя працэсы ў Сярэдняй Азіі, у некаторых раёнах Сібіры і Казахстана, і перш за ўсё ў Чарназёмнай зоне РСФСР, поўнасцю нармалізаваліся.

І ўсё ж можна канстатаваць, што паказчыкі міграцыйнага барометра недвухсэнсава сведчаць аб правільнасці таго курсу, які Савецкая дзяржава праводзіць у вёсцы.

ЗБЛІЖЭННЕ ЎМОЎ ПРАЦЫ І БЫТУ Ў ВЁСЦЫ І ГОРАДЗЕ

Савецкая аграрная палітыка прадугледжвае дзве ўзаемазвязаныя мэты: рост вытворчасці і адначасова павышэнне жыццёвага ўзроўню сельскага насельніцтва.

За апошні час, асабліва пасля сакавіка 1965 года, калі была ўведзена ў дзеянне праграма інтэнсіфікацыі сельскай гаспадаркі, даходы сельскіх жыхароў рэзка павялічыліся. Але справа не толькі ў памерах заработкаў. Галоўнае заключаецца ў тым, што якасць жыцця ў сельскай мясцовасці набліжаецца да гарадскіх стандартаў.

Гэта знайшло адлюстраванне і ў асноўных напрамках сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны ў 80-х гадах, прынятых XXVI з'ездам КПСС, і ў пяцігадовым плане на 1981—1985 гады.

Напрыклад, у цэлым па краіне аб'ём рэалізацыі бытавых паслуг павялічыцца прыкладна ў 1,4—1,5 раза, але ў сельскай мясцовасці аб'ёмы прадугледжваюцца больш высокія.

Праграма жыллёвага будаўніцтва вялікая (пабудаваць жылыя дамы агульнай плошчай 530—540 мільёнаў квадратных метраў), але ў першую чаргу жыллём павінны забяспечвацца работнікі новых прадпрыемстваў, жыхары асвойваемых раёнаў і сельскай мясцовасці. У вёсцы расшыраюцца магчымасці індывідуальнага будаўніцтва жылых дамоў.

Вялікая ўвага звяртаецца на расшырэнне абслугоўвання сельскага насельніцтва рознымі відамі транспарту.

Адзін з важнейшых рэзерваў росту савецкай эканомікі ў 80-х гадах — эканомнае, рацыянальнае, эфектыўнае выкарыстанне ўсіх наяўных рэсурсаў: працы, асноўных фондаў, паліва, сыравіны, прадукцыі палёў і ферм. Не сакрэт, што цяпер даводзіцца эканоміць літаральна на ўсім. У прыватнасці, дзяржава ўжо не мае магчымасці павялічваць удзельную вагу інвестыцый у аграрную сферу (яны і так дасягнулі 27 працэнтаў укладанняў ва ўсе галіны народнай гаспадаркі). Але, робячы больш жорсткім рэжым эканоміі, дзяржава не лічыць магчымым эканоміць на затратах, што маюць на мэце павысіць якасць жыцця сельскага насельніцтва.

Ажыццяўляючы курс на збліжэнне ўмоў працы і быту ў вёсцы і горадзе, наша дзяржава шукае шляхі рэгулявання ўнутранай міграцыі, аптымізацыі размеркавання рабочай сілы паміж галінамі народнай гаспадаркі без страт для кожнай з іх.

Гэта адзін з наглядных прыкладаў выкарыстання сацыяльных фактараў росту эканомікі ў практыцы 80-х гадоў.

Леў ВАСКРАСЕНСКІ.

САВЕЦКІ ЧАЛАВЕК — КАВАЛЬ СВАЙГО ЛЁСУ

ЧЫМ ДАРАЖУ

Не, гэта недаравальна: быць у Мінску і не зайсці ў мастацкі музей, калі там экспануецца выстаўка ліёнскіх тканін. І справа не толькі ў іх сусветнай вядомасці — тут яшчэ і прафесійная цікавасць (я ж таксама ткачыха), і неастыўшыя яшчэ ўспаміны аб сустрэчы з французскімі калегамі (не так даўно мне з групай турыстаў давялося падарожнічаць па Міжземнамор'ю). Вось Жаклін — мая выпадковая знаёмая француженка. Як мне шкада было яе, калі, гледзячы на калону дэманстрантаў, яна з горыччу казала:

— Пратэстуюць супраць беспрацоўя. Бачыце, колькі сярод іх маіх равеснікаў? У нас на фабрыцы моладзі таксама нялёгка. Гаспадарам імпануе наша здароўе, але майстэрства, вопыту нам не стае... У ткачоў жа не канвеер, а станок, дзе выпрацоўка, якасць прадукцыі залежаць толькі ад цябе. Вось і атрымліваецца: пакуль малады — пнешся, каб дагнаць; настарэеш — з апошніх сіл намагаешся, каб цябе не дагналі. Не праца — пакуты...

Падоўгу мы амаль што нідзе не затрымліваліся — праграма групы была насычанай, вось і не змагла тады дастаткова пагутарыць з Жаклін, толькі паспрабавала, як магла, суцешыць яе. Але ці будзе лёс дзяўчыны шчаслівым?

Падарожнічаем па Іспаніі. І зноў — «Патрабуем работы!» Па Італіі, Грэцыі — тыя ж лозунгі дэманстрантаў. А ў Стамбуле ўбачыла нават 5—7-гадовых дзяцей, якія ўсё гатовы былі зрабіць за грошы.

Дзіка гучыць гэта для нас, савецкіх людзей! Я ўсё жыццё вучыла і вучу сваіх сыноў: шукайце шчасце ў працы! Добрасумленнай, патрэбнай людзям. А ёсць, аказваецца, мільёны людзей, якія бачаць найвялікшае шчасце ў тым, каб толькі знайсці сабе работу. Не па прызванню, не па душы, а хоць бы якую-небудзь, абы плацілі, абы выжыць... Не, няма сярод маіх савецкіх знаёмых сяброў такіх, хто б жыў і працаваў з гэткай вось трывожнай бяскрыласцю. Я асабіста ўдзячная лёсу, што стала не кім-небудзь, а ткачыхай, і што працую не дзе-небудзь, а на Магілёўскай стужкаткацкай.

Так дваццаць гадоў і працую ткачыхай. І фабрыка за гэты час роднай стала, і людзі нібы тыя сваякі.

Цікава, што б падумала Жаклін, якая ўпэўнена, быццам поспех ткача залежыць толькі ад яго аднаго, каб паглядзела, скажам, на тыя ж конкурсы рабочага майстэрства, якія праводзяцца ў нас. Уяўляю яе збянтэжанасць: як гэта так — людзі, чый заработак непасрэдна звязаны з вынікамі працоўнага саперніцтва, не тоячыся, расказваюць, паказваюць, якім чынам ім удаецца эканоміць секунды, мінуты?! Дарэчы, калі шэсць гадоў назад сабраліся ў Каўнасе для абмену вопытам лепшыя ткачыхі галіны, вырашана было зняць фільм.

Успомніўся расказ рэжысёра: да рэвалюцыі многія лепшыя рабочыя працавалі пад спецыяльнымі каўпакамі, з ліхтарамі, каб ніхто не бачыў, як, за кошт якіх прыёмаў яны дабіваюцца лепшых вынікаў. А хіба і сёння, у нашы дні, не пад тымі ж каўпакамі вымушаны працаваць Жаклін і яе старэйшыя сяброўкі?!

Нам, калектывістам, гэта незразумела. Наша сіла — у агульным поспеху. А што датычыць фільма, дык ён, паводле водгукаў, многім дапамог. Ніколі не забыць мне пра ўдзел у рабоце XXVI з'езда КПСС, калі мы, прадстаўнікі розных рэспублік, выпрацоўвалі праграму далейшага сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны. І каму, як не нам, дэлегатам, трэба было паказаць прыклад у ажыццяўленні намечаных планаў! Разам з членамі нашай брыгады Інай Бацвянковай, Жэняй Маісеевай, Лідзіяй Гузавай мы вырашылі працаваць кожная на дванаццаці станках пры чатырох па норме. Інакш кажучы, выканаць за пяць гадоў па тры пяцігодкі. Гэта нялёгка, але мы зможам дамагчыся свайго: праз некалькі месяцаў першае пяцігадовае заданне будзе выканана. Перамаглі разам: сёння на расшыранай зоне абслугоўвання працуюць каля 200 чалавек. Веру: неўзабаве яна скорыцца і астатнім ткачыхам, мы дапаможам ім.

Што значыць дапамога сяброў, якая гэта моцная, надзейная падтрымка ў жыцці, я зразумела даўно, на самым пачатку жыццёвай дарогі. Толькі-толькі мы пажаніліся з Анатолем, ледзьве пачалі падрастаць дзеці, як згарэў наш дом, а з ім і ўвесь няхітры набытак. Да ніткі. Сітуацыя такая, што рукі маглі апусціцца. Але падтрымалі, дапамаглі таварышы па рабоце. Мае сяброўкі сабралі грошы на ўсё неабходнае на першым часе, а заўком завода, на якім працаваў Толя, выдзеліў нам кватэру ў новым доме.

Тут дарэчы ўспомніць пытанне Жаклін, якое яна задала мне: «Вы, напэўна, багатая, калі выбраліся ў такое далёкае падарожжа?» — «Вельмі, Жаклін», — адказала ёй. Так, я лічу сябе вельмі багатым чалавекам. У маім разуменні багаты — значыць, шчаслівы. А дзяўчына мела на ўвазе мой заработак... Цікавае назіранне: там, за мяжой, я пастаянна чула: «Купіце!». Радзей — «Прадайце». А вярнулася назад, аб'ехаўшы паў-Еўропы, і дома, на рабоце мяне пыталіся — не «што купіла?», а — «Калізей бачыла?» «Ці спадабаўся Нотр-Дам?» «Мама, прывезла альбом Веласкеса?» — пытаюць дзеці.

Так, я шчаслівая, што ў мяне цудоўная сям'я. Я шчаслівая, што ў мяне ёсць любімая работа і надзейныя сябры. Я паважаю гэтых людзей — ткачых, майстроў, інжынераў, кіраўнікоў. Кожны з іх выдатны, сапраўдны савецкі чалавек. Калі давялося мне нядаўна сустрэцца з першым беларускім касманаўтам Пятром Клімуком, мы гутарылі з ім аб жыцці — а, значыць, аб іх, яго і маіх сябрах, таварышах па рабоце. І неяк непрыкметна выявілася цікавая дэталь: за тыя 20 з невялікім гадоў, што мінулі пасля пуску нашай фабрыкі, кожны з нас, хто так радаваўся тады палёту Юрыя Гагарына, і сам набраў за гэты час добрую жыццёвую вышыню. Закончыў завочна два інстытуты і стаў дырэктарам фабрыкі былы слесар Анатоль Мардашоў. Яго намеснікам працуе сёння былая снавальшчыца Ларыса Кадушка. Цяперашні наш галоўны інжынер — былая ткачыха Ніна Пятрова.

Спіс гэты можна працягваць. Але іменна тут, у гэтым месцы, магла б перабіць мяне Жаклін: «Ну, а ваша, Ніна Іванаўна, дзе вышыня, вашых сяброў, якія так і засталіся слесарамі, снавальшчыцамі, ткачыхамі?» Пытанне гэта рэзоннае толькі ў вуснах Жаклін. А для нас, хто жыве ў Краіне Саветаў, яго няма, бо мы ведаем: чалавек расце не толькі ў пасадзе. У нас, савецкіх, паважаюць рост людзей і ў іншых вымярэннях, скажам, рост маральны, прафесіянальны. Аднолькава, напрыклад, шануюць як славутага трактарыста, так і выдатнага старшыню калгаса.

...Думаю, што сказанага хопіць для вываду: праца — вось тое галоўнае, што куе лёс чалавека. І я шчаслівая, што жыву ў краіне, дзе чалавек працы ўзняты на небывалую ў гісторыі вышыню.

Расказ дэпутата Вярхоўнага Савета БССР Н. ДЗЕНІСЕНКА
запісаў А. УЛІЦЁНАК.

НА ЗДЫМКУ: Н. ДЗЕНІСЕНКА гутарыць з П. КЛІМУКОМ у Зорным гарадку.

Фота М. АМЕЛЬЧАНКІ.



Штодзённа дзесяткі аўтамашын з саўгаса «Мінская гароднінная фабрыка» накіроўваюцца да прадпрыемстваў грамадскага харчавання і ў магазіны беларускай сталіцы. На буйнейшым зімнім агародзе рэспублікі паспелі гуркі, буйна ідзе ў рост і іншая зеляніна.

Пасля ўступлення ў строй новай цяпліцы, дзе атрыманы першы ўраджай, прадпрыемства мае каля 26 гектараў закрытага грунту. Практычна ўсе складаныя аперацыі гароднінага канвеера механізаваны. Незалежна ад пары года пад плёначным пакрыццём добра адрэгуляваны тэмпературны рэжым, многа святла. Па замкнёнай гідраўлічнай сістэме ажыццяўляецца падглебавы абагрэў, паступленне і размеркаванне вільгаці.

У саўгасе вырошчваюць высокаўраджайныя сарты гуркоў малдаўскай і маскоўскай селекцыі. За вегетацыйны перыяд кожная расліна дае па пяць і больш кілаграмаў пладоў.

Для атрымання стойкага пасадачнага матэрыялу адведзены спецыяльныя гадавальнікі. Мікраклімат у іх поўнасцю адпавядае рэжыму цяпліц з асноўным грунтам.

Сёлета гаспадарка павялічыць продаж таматаў, зялёнай цыбулі, салаты, сельдэрэя і іншай зеляніны, паставіць для гараджан каля шасці тысяч тон гароднінны.

НА ЗДЫМКАХ: гуркі для магазінаў Мінска; агарод пад плёнкай; добрую расаду памідораў вырасціла цяплічніца Эма СЕЛІВОН.

Фота В. ВІТЧАНКІ.

ДРУГАЯ РЭСПУБЛІКАНСКАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ БЕЛАРУСКАГА ТАВАРЫСТВА «РАДЗІМА»

ПРАЦА НА КАРЫСЦЬ МІРУ І ЎЗАЕМАРАЗУМЕННЯ

21 красавіка ў Мінску адбылася другая рэспубліканская канферэнцыя Беларускага таварыства па культурных сувязях з суайчыннікамі за рубяжом. У яе рабоце прынялі ўдзел прадстаўнікі рабочага класа і калгаснага сялянства, міністры, пісьменнікі, артысты, журналісты, настаўнікі, кампазітары, кіраўнікі грамадскіх арганізацый.

Гасцямі канферэнцыі былі Уладзімір Аўсяннікаў, загадчык аддзела Савецкага таварыства «Родина», і рэдактар латышскай газеты «Дзімтенес балс» Дайніс Голбергіс.

Са справаздачным дакладам, у якім былі падведзены вынікі работы Беларускага таварыства «Радзіма» за мінулыя пяць гадоў, выступіў старшыня прэзідыума Таварыства, народны мастак СССР Міхаіл Савіцкі. Ён адзначыў, што для савецкіх людзей гэта быў час напружанай творчай працы, накіраванай на выкананне задач, пастаўленых XXV і XXVI з'ездамі КПСС. Мы здзяйснялі велічныя планы палітычнага, сацыяльна-эканамічнага, навукова-тэхнічнага і культурнага развіцця. Савецкая краіна была пастаянным ініцыятарам палітыкі мірнага суіснавання дзяржаў з розным сацыяльна-палітычным ладам. І гэта не магло застацца не заўважаным ва ўсім свеце.

Аднак нашы поспехі, вынікі разрадкі, за якую многія гады змагаецца наша партыя і ўрад, рост аўтарытэту і ўплыву сацыялістычнай садружнасці выклікалі жорсткае супраціўленне найбольш агрэсіўных колаў сусветнага імперыялізму на чале са Злучанымі Штатамі Амерыкі, што, як вядома, прывяло да абвастрэння міжнароднай абстаноўкі. Вось чаму так актуальна гучаць сёння словы Генеральнага сакратара ЦК КПСС Л. І. Брэжнева аб тым, што адным з важнейшых фактараў сучаснага міжнароднага развіцця з'яўляецца актыўны ўдзел народных мас, іх арганізацый, палітычных партый у вырашэнні праблем вайны і міру.

Наглядным пацверджаннем усё больш шырокага ўдзелу грамадскасці ў вырашэнні ак-

туальных праблем нашых дзён, у ажыццяўленні ленінскага міралюбівага курсу, у развіцці супрацоўніцтва і ўзаемаразумення з зарубежнай грамадскасцю з'яўляецца дзейнасць Беларускага таварыства па культурных сувязях з суайчыннікамі за рубяжом. За справаздачны перыяд Таварыствам былі ўстаноўлены сувязі больш чым з 30 зарубежнымі прагрэсіўнымі і нейтралісцкімі арганізацыямі, з сотнямі асобных суайчыннікаў. Многія з іх актыўна супрацоўнічаюць з нацыянальнымі саветамі міру і таварыствамі дружбы з СССР у сваіх краінах, прымаюць удзел у палітычных кампаніях за спыненне гонкі ўзбраенняў, шырока прапагандуюць савецкую культуру, мастацтва, навуку. У якой бы краіне ні жылі

нашы зарубежныя землякі, іх аб'ядноўвае пачуццё патрыятызму, любоў да сваёй Радзімы або Радзімы бацькоў, жаданне ўнесці ўклад у агульную справу барацьбы за мір і добрыя адносіны паміж усімі народамі.

Мы з задавальненнем можам адзначыць, сказаў дакладчык, што за справаздачны перыяд значна расшырыліся сувязі Беларускага таварыства «Радзіма» з групамі, аб'яднаннямі землякоў за рубяжом, з асобнымі суайчыннікамі. За гэты час наша Таварыства прыняло сотні гасцей з-за рубяжа, якія прыязджалі ў складзе турысцкіх груп, на курсы па вывучэнню мовы і культуры, на курсы для кіраўнікоў калектываў мастацкай самадзейнасці. Нас наведалі моладзь, якая падарожнічала па краіне Саветаў, дзеці, што адпачывалі ў піянерскім лагеры і г. д. Мы паказваем ім нашы здабыткі і дасягненні, расказваем аб пераменах, што непазнавальна змянілі Беларусь у братняй сям'і народаў Савецкага Саюза, 60-гадовы юбілей якога мы сёлета будзем урачыста адзначаць.

Важнай крыніцай інфармацыі для нашых зарубежных суайчыннікаў з'яўляецца газета «Голас Радзімы», якая нясе за мяжу праўду аб Савецкай краіне, расказвае аб яе ўнутранай і знешняй палітыцы, дапамагае сумленным людзям разабрацца ў міжнароднай абстаноўцы, зразумець, дзе праўда, а дзе хлусня. Аб тым, як неабходны «Голас Радзімы» яго чытачам за рубяжом, сведчаць іх пісьмы, якія штодзень прыносіць рэдакцыйная пошта. Яны прыходзяць з усіх куткоў свету. І ў кожным падзяка за вестачку з Бацькаўшчыны, за словы праўды — сведчанне таго, што наша праца патрэбна людзям. Акрамя газеты, рэдакцыя штогод выдае кніжкі і брашуры, прысвечаныя, як правіла, найбольш важным падзеям года, найбольш знамянальным юбілеям. Аўтарамі іх з'яўляюцца вядомыя беларускія вучоныя, пісьменнікі, журналісты.

Вядзе свае перадачы на нацыянальнай мове і радыёстанцыя «Савецкая Беларусь». Штодзень на працягу гадзіны яна дае магчымасць землякам, якія жывуць у Заходняй Еўропе, атрымліваць шырокую па аб'ёму, глыбокую па зместу, цікавую па форме інфармацыю аб гісторыі і сённяшнім дні рэспублікі, яе велізарных дасягненнях ва ўсіх галінах.

Беларускі народ, як і ўсе народы Савецкага Саюза, рыхтуецца адзначыць 65-ю гадавіну Вялікага Кастрычніка, 60-годдзе ўтварэння СССР, 100-годдзе з дня нараджэння Я. Купалы і Я. Коласа. Разам з намі гэтыя даты будуць адзначаць і землякі за мяжой. Па іх просьбе Таварыства дапаможа ім у арганізацыі выставак і фотавыставак, дэманстрацыі кінафільмаў, у папаўненні грамадскіх і прыватных бібліятэк.

На канферэнцыі выступілі з прамовамі многія дэлегаты. Яны далі станоўчую ацэнку

дзейнасці Беларускага таварыства «Радзіма» за пяць гадоў, прааналізавалі работу рэдакцыі газеты «Голас Радзімы» і радыёстанцыі «Савецкая Беларусь».

— Я даўні і пастаянны чытач «Голасу Радзімы», — сказаў, пісьменнік Янка Брыль. — Заўсёды з прыемнасцю атрымліваю яе і чытаю. У газеце з густам падбіраюцца матэрыялы, у ёй працуе цікавы аўтарскі актыў, добра асвятляюцца пытанні эканомікі, культуры, гісторыі нашага народа. Калісьці і мне тры цяжкія гады давялося пражыць удалечыні ад Бацькаўшчыны. Я ведаю, якой дарагой бывае кожная вестачка з дому, якую цікавасць выклікае самая, здавалася б, дробная падзея. «Голас Радзімы» добра інфармуе сваіх чытачоў аб усім, што адбываецца ў Беларусі, ва ўсёй нашай вялікай краіне.

Артыст Беларускай дзяржаўнай філармоніі цымбаліст Аляксандр Ляончык расказаў пра сваю паездку ў складзе тургрупы па гарадах Канады і Злучаных Штатаў Амерыкі. Іх канцэрты заўсёды праходзілі з нязменным поспехам, асаблівую цікавасць выклікалі беларускія цымбалы, краналі сэрцы людзей задушэўныя народныя мелодыі. А пасля выступленняў артыстаў звычайна запрашалі ў госці землякі-беларусы, рускія, украінцы, дзе канцэрты паўтараліся і доўга вяліся цікавыя для абодвух бакоў гаворкі.

Перад удзельнікамі канферэнцыі выступіў і Мітрапаліт Мінскі і Беларускі, Патрыяршы экзарх Заходняй Еўропы Філарэт, у прамове якога прагучаў заклік да міру, да ўзаемаразумення, брацтва.

— Ужо на самым пачатку рускай дзяржаўнасці, — сказаў ён, — царква садзейнічала ўстанаўленню грамадзянскага парадку, асуджала рабаўладанне, выхоўвала ў людзях пачуццё адказнасці і абавязку, стварала помнікі, што ўзбагацілі нашу нацыянальную культуру. У цяжкія часы варожага нашэсця царква ўмацоўвала дух народа, падтрымлівала пачуццё нацыянальнай годнасці, заклікала быць вернымі патрыятычнаму абавязку. Як прыклад актыўнай дзейнасці рускай праваслаўнай царквы на карысць Айчыны і міру магу ўказаць на Сусветную канферэнцыю рэлігійных дзеячаў за выратаванне свяшчэннага дара — жыцця ад ядзернай катастрофы. Гэта сустрэча павінна адбыцца сёлета ў маі.

Канкрэтныя прапановы па паляпшэнню работы Беларускага таварыства «Радзіма» ўнеслі выступаўшыя з прамовамі М. Ягораў, намеснік старшыні Беларускай рэспубліканскай камісіі садзейнічання Савецкаму фонду міру; Н. Ермалюк, загадчык аддзела прэс-інфармацыі Беларускага таварыства дружбы і культурнай сувязі з зарубежнымі краінамі; М. Паўлоўскі, старшыня Брэсцкага аддзялення Беларускага таварыства «Радзіма»; М. Германаў, старшыня Бюро міжнароднага маладзёжнага турызму «Спутник» ЦК ЛКСМБ, і іншыя прамоўцы.

У рэзалюцыі, якую прыняла II рэспубліканская канферэнцыя Беларускага таварыства «Радзіма», адзначалася, што важнай задачай Таварыства з'яўляецца працяг работы па далейшаму згуртаванню сіл, у тым ліку і сярод суайчыннікаў, якія выступаюць за развіццё ўсебаковых адносін і супрацоўніцтва з Савецкім Саюзам, па расшырэнню кола сяброў нашай краіны, умацаванню давер'я і ўзаемаразумення паміж краінамі і народамі.

Дэлегаты канферэнцыі абралі савет Беларускага таварыства «Радзіма», які будзе кіраваць яго работай у перыяд паміж канферэнцыямі, а таксама рэвізійную камісію. На сваім першым пасяджэнні новы савет абраў прэзідыум Таварыства, які па-ранейшаму будзе ўзначальваць дэпутат Вярхоўнага Савета БССР, народны мастак СССР, член-карэспан-

дэнт Акадэміі мастацтваў СССР Міхаіл Савіцкі. Яго першым намеснікам абраны Мікалай Васілёнак, намеснікам — Мікалай Слінко, членам прэзідыума — рэдактар газеты «Голас Радзімы» Вацлаў Мацкевіч.

НА ЗДЫМКАХ: са справаздачным дакладам выступае старшыня Беларускага таварыства «Радзіма» Міхаіл САВІЦКІ; у прэзідыуме канферэнцыі; на трыбуне — пісьменнік Янка Брыль; артыст Белдзяржфілармоніі Аляксандр ЛЯОНЧЫК; Мітрапаліт Мінскі і Беларускі ФІЛАРЭТ; у зале канферэнцыі.

Фота С. КРЫЦКАГА.

З пошты «Голасу Радзімы»

ІНШАГА ВЫБАРУ НЯМА

Калі спытаць, якая самая надзённая праблема стаіць сёння перад чалавецтвам, большасць людзей, не задумваючыся, адкажа: захаванне міру на зямлі. Ва ўсе часы войны прыносілі пакуты і гора народам, знішчалі матэрыяльныя каштоўнасці, сціралі з твару зямлі сёлы і цэлыя гарады, уносілі мільёны чалавечых жыццяў. Каб залячыць ваенныя раны, патрэбны былі доўгія гады карпатлівай працы. Але яшчэ ніколі вайна не была такой небяспечнай для людзей, як цяпер. Нястрымная гонка ўзбраенняў, развязаная імперыялістамі заходніх краін, паставіла нашу планету на край бездані. Навейшыя віды магутнай ядзернай зброі здольны знішчыць усё насельніцтва Зямлі, і нават не адзін раз. Быць або не быць чалавецтву? — вось як сёння стаіць пытанне.

Разумеюць гэта і замежныя нашы суайчыннікі. Сярод шматлікіх пісем, якія прыходзяць у рэдакцыю ад іх, няма ніводнага, дзе б не гаварылася аб праблеме захавання міру. Іх гэта праблема хвалюе асабліва. У лёсах тысяч нашых суайчыннікаў мінулая вайна адыграла ракавую ролю, зламала іх жыццё, назаўсёды разлучыла з Радзімай, дарагімі і блізкімі людзьмі.

«Цяпер я чытаю кнігу «Я з вогненнай вёскі...»,— паведамляе Марыя Гарох з Бельгіі.— У ёй апісваюцца зверствы гітлераўцаў на акупіраванай тэрыторыі маёй роднай Беларусі ў час Вялікай Айчыннай вайны. Чытаю вельмі павольна. Прачытаю некалькі старонак і далей не магу, так бярэ за душу і сэрца. Нават не даходзіць да свядомасці, як маглі рабіць такое «людзі». Так, фашыстаў я нават і не магу назваць людзьмі. І ў маё жыццё яны прынеслі шмат гора. Няхай яны будуць праклятыя! Няхай назаўсёды будзе праклята вайна!»

«Цяперашняя адміністрацыя Белага дома сваёй вар'яцкай палітыкай адкрыта штурхае чалавецтва да сусветнай тэрмаядзернай вайны, — піша Аляксандр Сяргееў з ЗША. — Да небывалага ўзроўню растуць расходы на гонку ўзбраенняў. Гаворыцца аб магчымасці абмежаваць ядзерную вайну рамкамі Еўропы і перамагчы ў ёй. ЗША нахабна ўмешваюцца ва ўнутраныя справы іншых дзяржаў, стараюцца мець узброеныя сілы ўсюды, дзе, на думку Вашынгтона, існуюць «жыццёва важныя амерыканскія інтарэсы».

Гэтыя «інтарэсы» знаходзяцца за тысячы кіламетраў ад саміх Злучаных Штатаў. Сёння звыш пяцісот тысяч амерыканскіх салдат «абараняюць амерыканскія інтарэсы» на дзвюх з палавінай тысячах баз і ваенных аб'ектаў больш чым у 110 краінах планеты. Зразумела, што амерыканская ваенная прысутнасць зусім не радуе насельніцтва гэтых краін».

Але па добрай волі імперыялісты ніводнай краіны не пакідалі.

«Іх запаветнае жаданне — вярнуць тыя часы, калі яны былі поўнымі гаспадарамі ва ўсім свеце, — лічыць Аляксей Грыцук з Канады. — Тады, рабуючы прыгнечаныя народы, капіталісты развітых краін набівалі свае сейфы золатам. Але цяпер рабаваць іншых усё больш цяжка.

Цяжэй становіцца рабаваць і свой уласны народ. Расходаванне мільярдных сум з дзяржаўнага бюджэту на ўзбраенне адбываецца за кошт урэзвання сродкаў на розныя сацыяльныя праграмы, пазбаўляе тысячы людзей сродкаў да існавання. Што гэта, як не грабеж сваіх жа суайчыннікаў? Адміністрацыя Рэйгана зрабіла замах нават на дапамогу на беспрацоўю і сняданкі для школьнікаў. Падобныя дзеянні трэба неяк апраўдаць перад народам. Ужо многа гадоў апраўданне ў імперыялістаў адно — старая казка аб «савецкай ваеннай пагрозе». Абараняцца ад гэтай «пагрозы» Злучаныя Штаты чамусьці маюць намер на тэрыторыі Еўропы. Яны распрацавалі нават планы ядзерных удараў па тэрыторыях саюзных дзяржаў. Не мае значэння, што такая абарона знішчыць мільёны тых, каго збіраюцца абараняць. З падобным падыходам да свайго лёсу еўрапейскія народы згадзіцца не могуць. Не хочуць быць алавянымі салдацікамі ў гульнях натаўскіх стратэгаў, гатовых у любую мінуту кінуць іх у агонь. Тым больш, што ніхто не можа ўспомніць, каб Савецкі Саюз калі-небудзь каму-небудзь пагражаў. Па ўсёй Еўропе шырыцца пратэст супраць авантурыстычных планаў Вашынгтона і яго саюзнікаў».

«У горадзе Амстэрдаме прайшла заключная дэманстрацыя ўдзельнікаў маршу міру ў Галандыі,— паведамляе Надзея Галіёнка. — У ёй прынялі ўдзел звыш чатырохсот тысяч чалавек. Дэманстранты выступалі супраць ядзернай вайны, вытворчасці нейтроннай і хімічнай зброі, супраць размяшчэння новых амерыканскіх ракет у Еўропе. Амерыканцы ў сваёй прапагандзе спрабуюць запалохаць нас тым, што Савецкі Саюз хоча вайны. Але ўвесь галандскі народ добра ведае, што савецкім людзям зусім не патрэбна вайна, яны хочуць міру і дружбы на ўсёй планеце. Амерыканскім агрэсарам проста зайздросна, што палітыка нашай Радзімы набывае ўсё большы аўтарытэт у народаў свету».

У сваёй знешняй палітыцы наша краіна з першага дня свайго існавання нязменна кіравалася ленінскімі міралюбівымі прынцыпамі. Гэта неаднаразова было даказана на справе. Ужо сёлета нашым урадам быў прапанаваны шэраг новых каштоўных ініцыятыў, накіраваных на ўмацаванне разрадкі і міру на зямлі.

«З 1917 года Савецкі Саюз зноў і зноў паўтарае, што хоча міру з усімі народамі, — гаворыць у сваім пісьме Юрый Расадзінскі з Аўстраліі. — Многа мірных прапаноў было зроблена савецкім кіраўніком Леанідам Брэжневым у мінулым годзе і сёлета. Але аб гэтым мы даведваемся толькі з савецкіх газет. У нашым жа друку цяжка знайсці пераказ савецкіх мірных ініцыятыў. Гэта жахліва! Калі б усе газеты на зямлі так пісалі аб міры, як газеты Краіны Саветаў, то ніколі не было б вайны».

Але праўду аб становішчы ў свеце ўтойваць цяжка. Яна пранікае ва ўсе краіны, на ўсе кантыненты.

Вось якое пісьмо прыйшло да нас з ЗША. Бернар Сіліч нарадзіўся ў Амерыцы і толькі нядаўна разам з жонкай і дзецьмі ўпершыню наведаў радзіму бацькі. Ён піша:

«Знаходзячыся ў вашай цудоўнай краіне, мы былі зачараваны яе прыгажосцю і выдатнымі людзьмі. Два найбольш моцныя ўражанні ад гэтай паездкі застаюцца з намі і сёння. Першае — грандыёзнасць мірнага будаўніцтва ва ўсіх кутках вашай вялізнай краіны. І другое — як свята ўшаноўваюць у вас памяць загінуўшых у барацьбе з фашызмам у час другой сусветнай вайны, як моцна ўсе людзі хочуць, каб вайна ніколі не паўтарылася. Мы паехалі з новымі поглядамі на жыццё. Рашучасць вашых людзей не дапусціць вайны натхніла нас павялічыць уласныя намаганні ў рабоце на карысць міру і разрадкі».

Трывога і неспакой за будучае прымушаюць уключацца ў барацьбу за раззбраенне, разрадку і мір усё больш і больш людзей у розных краінах. Набірае сілу гэта барацьба і на амерыканскім кантыненце. Аб гэтым напісаў Уладзімір Гаўрыцкі з Канады.

«Тут паклёп супраць нашай Радзімы пачынае крыху сціхаць, — гаворыцца ў яго пісьме. — Цяжка ім процістаяць справядлівай мірнай палітыцы СССР. Тым больш, што сваіх уласных праблем хапае. Амаль па ўсіх гарадах Канады праходзяць дэманстрацыі пратэсту супраць размяшчэння амерыканскай зброі на канадскай зямлі. Беспрацоўныя ствараюць свае арганізацыі, каб сумесна дабівацца работы. Яны патрабуюць расходаваць мільёны на будаўніцтва жылых дамоў, стварэнне новых рабочых месц, а не на ядзерныя бомбы».

Аб сваім асабістым укладзе ва ўмацаванне міру паведаміла нам Нора Род з Канады:

«Сёння я напісала пісьмо прэзідэнту Рэйгану. Нагадала яму аб тым, як людзі аднесліся да спроб адміністрацыі ЗША сарваць Алімпіяду ў Маскве і хто ад гэтага пацярпеў. Расказала, з якой любоўю простыя людзі ставяцца да тых краін і кіраўнікоў, якія выступаюць за міжнароднае ўзаемаразуменне і мір, не развязваюць войнаў і не прымушаюць да гэтага іншых. Магчыма, ён мяне зразумее і зробіць вывады».

Вядома, цяжка чакаць, што адно пісьмо Норы Род прымусіць прэзідэнта Рэйгана, усю цяперашнюю адміністрацыю ЗША зрабіць пераацэнку каштоўнасцей у палітыцы. Для гэтага ўсе разумныя людзі павінны аб'яднацца разам і запатрабаваць спыніць нарошчванне ўзбраенняў, ліквідаваць пагрозу ядзернай вайны. Іншага шляху няма. Толькі агульнымі намаганнямі можна спыніць ад вар'яцтва лёгкадумных палітыканаў і адстаяць заўтрашні дзень планеты для мірнай будучыні нашых дзяцей і ўнукаў.

У клубе інтэрнацыянальнай дружбы Гомельскага Палаца піянераў і школьнікаў праводзяцца многія мерапрыемствы, прысвечаныя развіццю дружалюбных сувязей з замежнымі краінамі. Вучні ўдзельнічаюць і ў маршы міру, ужо сабралі больш тысячы подпісаў пад яго адозвай.
НА ЗДЫМКУ: кіраўнік клуба інтэрнацыянальнай дружбы Л. КУЛІК у час абмеркавання плакатаў, зробленых школьнікамі.

Што? * Як? * Чаму?

Замежная дэлегацыя наведала завод. Усяго гадзіны са дзве працягвалася яе знаёмства з арганізацыяй вытворчасці на прадпрыемстве. Вядома, за такі кароткі час нельга было аб усім падрабязна даведацца. Менавіта таму пасля заканчэння экскурсіі госці задалі гаспадарам шмат пытанняў. Сярод іх было і такое: як на савецкіх прадпрыемствах

РАБОЧЫЯ КІРУЮЦЬ ВЫТВОРЧАСЦЮ

На самай справе, тут, на заводзе, замежных гасцей знаёмілі з дырэктарам, яго намеснікамі, начальнікамі цэхаў і служб, майстрамі... Адным словам, з тымі службовымі асобамі, якія назначаны кіраваць вытворчасцю і выконваюць падобныя ж функцыі на любым іншым прадпрыемстве, не толькі ў нас, а, скажам, у ЗША ці Англіі, Францыі ці ФРГ. Дык якое ж дачыненне да кіравання заводам маюць радавыя рабочыя і служачыя СССР?

Самае непасрэднае. І гаспадары прывялі канкрэтныя прыклады з жыцця свайго аб'яднання.

Некалькі гадоў назад на заводзе імя Леніна праходзіў партыйна-гаспадарчы актыў. Абмяркоўвалася пытанне рэканструкцыі прадпрыемства. Дырэкцыя прапанавала пачаць будаўніцтва адміністрацыйнага корпуса. Але выступіў слесар зборачнага цэха і не згадзіўся з гэтым. Ён унёс на разгляд актыву сваю прапанову: у інтарэсах вытворчасці спачатку пабудаваць цэнтральны склад прадпрыемства. І актыў прыняў прапанову слесара. Чаму?

Па-першае, у старым адміністрацыйным будынку, хаця і было крыху цеснавата, але працаваць яшчэ можна. Па-другое, само жыццё дыктавала неабходнасць хутчэйшай пабудовы цэнтральнага склада. Механічныя цэхі не мелі месца для захоўвання дэталей. Яшчэ адна нязручнасць. Стварэнне ж цэнтральнага склада аблягчала работу цэхавых дыспетчарскіх служб.

Цяпер дэталі для зборачных цэхаў знаходзяцца не ў розных падраздзяленнях завода, а ў адным месцы. Зборачным цэхам дастаткова падаць заяўку, і неабходная колькасць дэталей у кантэйнерах паступае на канвееры...

У механічным цэху завода «Калібр», які ўваходзіць у аб'яднанне імя У. І. Леніна, ішоў рабочы сход. Абмяркоўвалася пытанне павелічэння выпуску прадукцыі. Цэхавая тэхналагічная служба настойвала на ўвядзенні ў штат дадатковай адзінкі — расточніка. Брыгада слесараў, якую ўзначальвае Іван Каласоўскі, прытрымлівалася іншай думкі. Рабочыя прапанавалі скараціць адзінку расточніка на іх участку і перавесці на другі. За кошт чаго?

За кошт асваення слесарамі сумежнай прафесіі расточніка. Узнікае пытанне: чаму слесары бралі на сябе дадатковыя клопаты? Можа хацелі прыбаўкі да зарплаты? Не. Тут ужо праявіліся спецыфічныя для нашага грамадства клопаты аб вытворчасці. Ці, як мы гаворым, радавы рабочы прадэманстраваў, што і ён, як і дырэктар прадпрыемства, з'яўляецца гаспадаром вытворчасці.

Яшчэ адзін прыклад. У зборачным цэху арганізоўвалася брыгада. Начальнік участка прапанаваў на пасаду брыгадзіра сталага рабочага. Але члены калектыву абралі іншага, маладога, затое больш энергічнага, выдатнага спецыяліста, эрудзіраванага ў пытаннях вытворчасці і, галоўнае, маючага арганізатарскія здольнасці. І хутка брыгада стала адной з лепшых у аб'яднанні.

Трэба падкрэсліць яшчэ адзін важны момант у кіраванні рабочых вытворчасцю. Гэта цеснае супрацоўніцтва з адміністрацыяй прадпрыемства. Больш дзесяці гадоў назад вядучыя канструктары завода імя У. І. Леніна спрабавалі запусціць у серыйную вытворчасць адзін з перспектыўных у народнай гаспадарцы электравымяральных прыбораў. На першым часе новы выраб «буксаваў». У пошук прычыны яго хібаў падключыліся к канструктарам слесары і рэгуліроўшчыкі. Іменна яны павінны былі даць заключэнне: ці можна выпускаць новы прыбор. Рабочыя, не шкадуючы свайго вольнага часу, праводзілі выпрабаванні, прапаноўвалі новыя электрасхемы і г. д. І ў рэшце рэшт заключэнні рабочых, якія яны далі аўтарытэтнай камісіі, адыгралі сваю ролю. Цяпер прыбор у народнай гаспадарцы мае шырокае прымяненне і працуе бездакорна.

Гаспадары прывялі замежным гасцям яшчэ нямала канкрэтных прыкладаў удзелу рабочых у кіраванні вытворчасцю. Расказалі аб пастаянна дзеючых рабочых вытворчых нарадах, прафсаюзах і іншых грамадскіх арганізацыях — аб чым у нашай газеце пісалася.

Вядома, у кароткай гутарцы нельга ахапіць усе бакі ўдзелу рабочых нашай краіны ў кіраванні вытворчасцю. Не будзем таксама сцвярджаць, што тыя замежныя госці ўсё правільна зразумелі. А вось замежныя студэнты сярэдніх і вышэйшых навучальных устаноў, якія кожны год праходзяць практыку на прадпрыемствах рэспублікі, добра знаёмы з удзелам рабочых у кіраванні вытворчасцю ў СССР. Гэты вопыт знаходзіць прымяненне не толькі ў сацыялістычных, але і ў многіх краінах, што сталі на шлях развіцця.

З БІЯГРАФІІ ПАЭТА І НАРОДА

БАГУШЭВІЧ І ЯНКА КУПАЛА

Янка Купала і Францішак Багушэвіч (Мацей Бурачок)... Два найдаражэйшыя прозвішчы. З пачуццём глыбокай пашаны і любові мы заўсёды вымаўляем іх. І не выпадкова, жыццё і творчасць гэтых двух волатаў нашай літаратуры — узор служэння роднаму народу. Іх каларытныя постаці стаяць побач у гісторыі Беларусі. Калі завяршаўся жыццёвы круг Францішка Багушэвіча, Купалу было ўжо амаль васемнаццаць, і, безумоўна, калі б тагачаснае літаратурнае жыццё асвятлялася гэтак жа шырока, як зараз, Купала мог бы даведацца пра Багушэвіча яшчэ пры яго жыцці, нават сустрэцца з ім.

Аднак такая сустрэча, на жаль, не адбылася. Упершыню Янка Купала пачуў пра Багушэвіча ў канцы 1904 ці пачатку 1905 года. У тую пару ён працаваў чорнарабочым на броварах. Знаёмства з Багушэвічавай творчасцю скаланула ўсю душу маладога Купалы.

Сёння няцяжка ўявіць, што перажыў малады Купала ад чытання Багушэвічавых твораў. Асабліва, мабыць, узрушыла яго прадмова да «Дудкі беларускай». Яна перш за ўсё адкрыла Купалу самога сябе, дапамагла ўсвядоміць юнаку сваю нацыянальную прыналежнасць. І малады паэт пачынае шукаць **свой** шлях, спрабуе **свой** голас. Праўда, напачатку яго песня яшчэ часта пераклікаецца з Багушэвічавай. Згадаем верш аўтара «Дудкі беларускай» «Дурны мужык, як варона» і Купалавага «Мужыка». Нават неспрактыкаванае вока лёгка вызначыць у іх шмат агульнага. Можна яшчэ доўжыць спіс твораў абодвух паэтаў, якія перагукваюцца сваёй тэматыкай, ідэйнай накіраванасцю, пафасам гучання. Гэта ў першую чаргу тыя творы, галоўны герой якіх селянін, пагарджаны мужык-беларус. У Багушэвіча: «Не цурайся», «Гора», «Мая хата», «Калыханка». Адпаведна ў Купалы: «Пашкадуй мужыка», «Мая доля», «Над калыскай», «Мая хатка». Нават назвамі гэтыя творы блізкія адзін да аднаго...

Шмат агульнага ў паэтаў і ў паходжанні псеўданімаў, і ў назвах паэтычных зборнікаў. Агульнасць гэтая сведчыць аб духоўнай пераемнасці, творчай еднасці малодшага паэта са старэйшым. Купала адкрыта засвойваў творчыя дасягненні свайго папярэдніка, развіваў і паглыбляў асноўныя матывы яго творчасці. Нездарма ж, мусіць, Купалавы і Багушэвічавы творы выклікалі аднолькавы гнеў у царскіх улад. Як вядома, кнігі абодвух паэтаў трапілі ў адзін год (1908) пад арышт, а пасля і на судовы разгляд. Іх нават афармілі напачатку ў адзін дакумент. Праўда, Янку Купалу неяк усё-такі ўдалося ўхіліцца ад суда. Багушэвічавы ж творы судзілі па ўсіх правілах, па ўсіх тагачасных законах, нават з адвакатам. Быў на тым судзе і Янка Купала. Ён не мог не пайсці: гэта ж судзілі іх абодвух, судзілі вольнае беларускае слова. Купала, паводле слоў Я. Хлябцэвіча, сядзеў на хорах разам з публікай і кожнае слова абвінаваўцы пра Багушэвічавы творы прымаў шчымліва, з болем, абурэннем. Суд гэты, мабыць, і чыніўся, каб паслабіць дух дзеячаў маладой беларускай літаратуры, яе адданых сыноў. Але дарэмныя былі намаганні царскіх чыноўнікаў і іх служак. Купала выйшаў з таго суда яшчэ больш загартаваны. Слова яго загучала яшчэ больш палымяна, яшчэ больш свядома. Праўда, чарнасоценцы і шавіністы яшчэ не раз спрабавалі шальмаваць, зневажаць імёны гэтых паэтаў. Вось адзін цікавы выпадак. Пецярбургскі «Альманах — каляндар для ўсіх» на 1910 год змясціў на сваіх старонках партрэт Багушэвіча, але за подпісам, што гэта Янка Купала. Малады паэт тады абурыўся, напісаў свой пратэст у газету «Новая Русь». І зрабіў правільна. Але было ў гэтай «памылцы» нешта сімвалічнае і шматзначнае.

У дакастрычніцкі час творы Я. Купалы і Ф. Багушэвіча чытачы ўспрымалі як нешта адно цэлае і непадзельнае. У сваіх лістах у «Нашу ніву» яны ставілі гэтыя прозвішчы побач, прасілі менавіта іх кніжак.

Янка Купала неаднойчы выказваў свае думкі і ўражанні пра Багушэвічавы творы. І кожнага разу ён вылучаў у гэтых згадках штосьці новае, адметнае. Так, 11 студзеня 1929 года паэт пісаў, што Багушэвічавы вершы пераканалі яго, што кніжкі на беларускай мове не горшыя за іншыя, а нават лепшыя, таму што ў іх гаварылася пра блізкіх яму людзей, з якімі ён разам жыў і працаваў.

Была ў Янкі Купалы і яшчэ адна сустрэча з Багушэвічам. Адбылася яна, мабыць, у 1912 годзе. Паэт разам з Уладзіславай Францаўнай, сваёй паплечніцай і сяброўкай, вырашыў наведаць Багушэвічавы мясціны: даўно карцела зірнуць на той кут, у якім гадаваўся і рос пясняр, мужнеў, набіраўся паэтычнай і грамадзянскай моцы.

Падахвоціла да вандроўкі Янку Купалу, мусіць, Уладзіслава Францаўна. Яна, маленькаю дзяўчынкаю, бачыла Багушэвіча. Ён прыязджаў да іх у Вішнева на паляванне, а затым ужо ў Вільні пасябравала з Багушэвічавай пляменніцай Юляй Родзевіч.

А тут яшчэ адна нагода. Грамадка віленскай інтэлігенцыі рыхтавалася ўшанаваць памяць Уладзіслава Сыракомлі: набліжалася пяцідзесятая гадавіна з дня яго смерці. У задуме было наведаць паэтаву магілу ў Вільні, з'ездзіць у Барэйкаўшчыну. Разам з іншымі паехаў на Сыракомлеву сядзібу і Янка Купала. Быў у той віленскай грамадцы сучаснік і сябар Ф. Багушэвіча Напалеон Роўба. Па дарозе ён шмат расказваў маладзейшым пра Багушэвіча, пра свае сустрэчы з ім. Успаміналася Багушэвічава імя ў самой Барэйкаўшчыне, якую ён, дарэчы, наведаў у 1897 годзе. Усё гэта і «падагрэла» Купалу прайсціся сцежкамі аўтара «Дудкі беларускай».

...Пачалі з Жупранаў. У маўклівым роздуме пастаялі ля паэтавай магілы, на якой тады стаяў высокі дубовы крыж з датамі жыцця: 1840—1900. Успомнілі віленскі суд 1910 года, смяхотны загад на арышт Багушэвіча ў 1908 годзе. Затым паклалі на магілу кветкі і пешшу, самым блізкім шляхам, праз лес,— гэтую дарогу ім падказалі жупранцы,— накіраваліся ў Кушляны. Пазней Уладзіслава Францаўна напіша: «Мы з ім наведалі месца, дзе жыў Францішак Багушэвіч. У Ашмянскім павеце, каля мястэчка Жупраны».

Цяжка сказаць, якія думкі нараджаліся ў падарожнікаў на песняровай сядзібе. Але зразумела адно: выйшлі яны на віленскі гасцінец з Багушэвічавай сядзібы з глыбокім перакананнем, што свой жыццёвы шлях яны абралі правільна, што трэба яшчэ больш самаахвярна служыць свайму народу.

Пасля яшчэ не раз прывядзе Янку Купалу яго шчырае сэрца на паэтаву магілу. Апошні раз ён быў тут у чэрвені 1941 года разам з Якубам Коласам, за некалькі дзён да пачатку вайны, па дарозе ў Вільнюс.

Пра гэтае наведванне Купалам Багушэвічавай магілы згадвае вядомы грамадскі і партыйны дзеяч Цімох Гарбуноў, які разам з іншымі ездзіў тады ў Вільнюс.

Янка Купала, як і многія тагачасныя пісьменнікі, пранёс праз усё жыццё сваю шчырую ўдзячнасць Багушэвічу за яго мужнае слова, за яго творчы і грамадзянскі подзвіг. Ён, паводле слоў украінскага паэта Паўла Тычыны, у сваёй дакастрычніцкай творчасці, «прытуліўшы да вуснаў сваіх беларускую дудку Багушэвіча, увесь час прыслухоўваўся да свайго народа, увесь час трапяткімі акордамі прымерваўся: а якую б яго ноту ўзяць, каб яна загучала яшчэ мацней за ноту Багушэвіча».

Такая была творчая лучнасць двух нашых песняроў, якія пачулі голас народа і ад яго імя на ўвесь свет апавясцілі пра неадольнае жаданне беларусаў людзьмі звацца і заняць пачэсны пасад між народамі.

Уладзімір СОДАЛЬ.

Пасля таго, як ты пакінуў
Край незабыўны і сяброў,
Трывожаць думы безупынна,
Вядуць у твой музей — дамоў.
Як быццам там цяпер жывеш ты...

М. ТАНК.

Вядуць думы... Клічуць усіх нас, каму дарагое імя вялікага сына Беларусі, тыя сцяжынкі, па якіх калісьці хадзіў Іван Дамінікавіч. Цяпер, вясною, вакол іх дружна зелянее рунь ды стаяць векавыя дубы, набухлыя пупышкамі дрэвы, гатовыя восьвось распусціцца лісточкамі.

А гэтым маладым дубкам, якія нядаўна пасадзілі вядомыя беларускія літаратары ў гонар 100-годдзя з дня нараджэння народнага песняра Янкі Купалы, яшчэ расці і расці доўгія дзесяцігоддзі, каб стаць магутнымі дрэвамі.

Месцам будучай дубровы стала зялёная паляна, што раскінулася на ўзгорку каля дома ў Вязынцы, дзе ў 1882 годзе ў сям'і Луцэвічаў нарадзіўся будучы паэт Янка Купала. Мінуць гады, і з кволых, тоненькіх саджанцаў вырасце ў купалаўскім запаведніку алея са ста дрэў...

НА ЗДЫМКАХ: дрэўца садзіць Максім ЛУЖАНІН; прысаду будучай купалаўскай дубровы засаджваюць паэты Анатоль ГРАЧАНІКАЎ, Васіль ЗУЁНАК, Рыгор БАРАДУЛІН.

Фота Я. КАЗЮЛІ.

ПЕРАМОЖЦЫ КОНКУРСУ

У Маскве падведзены вынікі XXIII Усесаюзнага конкурсу «Мастацтва кнігі-81». У ім прымалі ўдзел усе цэнтральныя і многія рэспубліканскія кніжныя выдавецтвы. Ад Беларускай ССР у конкурсе ўдзельнічалі выдавецтвы «Беларусь», «Мастацкая літаратура», «Юнацтва», «Вышэйшая школа», БелСЭ імя П. Броўкі, «Ураджай», «Навука і тэхніка».

Высокімі дыпломамі конкурсу ўзнагароджаны 9 беларускіх выданняў.

Асаблівых поспехаў дамаглося выдавецтва «Беларусь». У ліку лепшых яго выданняў — цудоўна афармленая палітычная кніга У. І. Леніна «Як арганізаваць спаборніцтва. Вялікі пачын» (мастак А. Ружо), відавы шматкаляровы фотаальбом «Мінск» падарункавага характару (мастак Л. Бетанаў) і унікальнае па зместу і з густам афармленае выданне М. Раманюка «Беларускае народнае адзенне» (мастак У. Савіч).

Выдавецтва «Мастацкая літаратура» атрымала дыплом за афармленне і выпуск да 100-годдзя з дня нараджэння вялікіх песняроў Беларусі Янкі Купалы і Якуба Коласа выбраных твораў паэтаў у перакладзе на рускую мову (мастакі Ю. Герасіменка, Ю. Зайцаў, А. Шэвераў). Ілюстрацыі да гэтых выданняў паэтычныя, вельмі сугучныя зместу, па-філасофску завостраныя. Прыгожа, на добрым прафесійным узроўні афармлена кніга Лопэ дэ Вэга «Раба свайго кахання. Дурнічка» (мастак В. Тарасаў).

Дзве ўзнагароды Усесаюзнага конкурсу заваявала параўнаўча нядаўна створанае выдавецтва «Юнацтва» за мастацкае афармленне кніг: паэму Янкі Купалы «Адвечная песня» (мастак В. Шаранговіч), «Балады» Ф. Шылера ў перакладзе на беларускую мову (мастак Г. Паплаўскі).

Амаль усе дыпламаваныя выданні надрукаваны на Мінскім паліграфічным камбінаце імя Я. Коласа.

Усесаюзны конкурс «Мастацтва-81» яшчэ раз наглядна засведчыў, што кнігавыдаўцы Беларусі плённа і якасна папрацавалі летась. Аб гэтым красамоўна гаворыць і той факт, што па мастацкаму афармленню і паліграфічнаму выкананню кніжнай прадукцыі наша рэспубліка выйшла на адно з першых месц у краіне.

М. ГАНЧАРОЎ,
галоўны мастак
Дзяржкамвыда БССР.

ФЕСТЫВАЛЬ НАЗЫВАЕ ЛАЎРЭАТАЎ

У сталіцы Эстоніі завяршыўся XV Усесаюзны кінафестываль. Журы адзначыла стужкі, створаныя майстрамі Масквы, Ленінграда, саюзных рэспублік — прадстаўнікамі ўсіх пакаленняў айчыннага кінематографа.

Галоўны прыз кінафестывалю прысуджаны мастацкай стужцы «Людзі на балоце» (Беларусьфільм). Прызам узнагароджана таксама актрыса А. Барзова, якая выканала галоўную ролю ў карціне.

Прыз журы атрымала і сумесная гістарычная стужка «Масфільма» і кіеўскай студыі імя А. Даўжэнкі — «Яраслаў Мудры». За лепшы мастацкі фільм і рэжысёрскі дэбют адзначаны пастаноўшчык стужкі «Што пасееш...» малады эстонскі рэжысёр П. Сім. Лепшай мужчынскай акцёрскай работай прызнана роля, сыграная ў гэтым фільме артыстам А. Кукумягі.

У гасцях у студэнтаў і супрацоўнікаў Мінскага дзяржаўнага медыцынскага інстытута з нагоды 100-годдзя з дня нараджэння Я. Купалы і Я. Коласа пабывалі заслужаны работнік культуры Беларусі, сын Якуба Коласа Даніла Міцкевіч, пісьменнікі Уладзімір Караткевіч і Генадзь Кісялёў, старшы навуковы супрацоўнік Літаратурнага музея Якуба Коласа Іван Курбека.
НА ЗДЫМКУ: кветкі ганаровым гасцям дораць студэнты. Фота А. ГЛІНСКАГА.

ЧАС, АДЛЮСТРАВАНЫ КІНАКАМЕРАЙ

НАТАТКІ ПРА САВЕЦКАЕ ДАКУМЕНТАЛЬНАЕ КІНО

Нядаўна ленінградскія кінадакументалісты правялі такі эксперымент: сабраўшы праграму сваіх стужак, паказвалі яе ўвесь дзень у лепшым кінатэатры горада. Ні на адным сеансе свабоднага месца не было... Гэта толькі адзін з доказаў таго інтарэсу, які выклікае ў СССР дакументальнае кіно. Аб яго міжнародным аўтарытэце могуць сведчыць шматлікія прэміі буйнейшых фестываляў.

Аб маштабах савецкай кінадакументалістыкі гавораць такія лічбы: на 28 студыях, размешчаных ва ўсіх саюзных рэспубліках, здымаецца штогод больш тысячы фільмаў і кіначасопісаў; плюс 400 стужак, ствараемых штогод у 30 дакументальных аб'яднаннях тэлебачання. Таму я спынюся толькі на некалькіх карцінах, здольных даць хоць нейкае ўяўленне аб тэматыцы і жанрах многанацыянальнага дакументальнага экрана СССР.

...У цішыні перапоўненай глядзельнай залы раптам раздаецца горкі жаночы плач. У кінатэатры ішоў адзін з дваццаці фільмаў эпапеі «Вялікая Айчынная» (гэты савецка-амерыканскі серыял, што апавядае пра барацьбу савецкага народа з гітлераўскай агрэсіяй, на Захадзе дэманстраваўся пад назвай «Невядомая вайна»). Пажылая глядачка ўбачыла ў кадрах, знятых франтавым аператарам амаль сорак гадоў назад, свайго мужа, што не вярнуўся з вайны... Потым у Маскву, на Цэнтральную студыю дакументальных фільмаў, дзе стваралася кінаэпапея, сталі прыходзіць дзесяткі, сотні пісьмаў. У кадрах ваеннай хронікі пазнаваліся бацькі, сыны, мужы, франтавыя таварышы.

Кінаэпапея ўскалыхнула ўсю краіну. Людзі розных пакаленняў дзякуючы «Вялікай Айчыннай» змаглі з новай часовай дыстанцыі і перажыць, і прааналізаваць той маральны вопыт, што дазволіў савецкаму народу — цаной незлічоных пакут і страт — перамагчы ў бітве з фашызмам... Вялікі поспех у гледачоў эпапеі не толькі ў СССР, але і ў дзесятках іншых краін незвычайна пашырыў аўдыторыю савецкага дакументальнага кіно.

Адразу пасля прэм'еры «Вялікай Айчыннай» яго аўтары звярнуліся да новай вялікай работы: 8-серыйны цыкл «За ўсё даражэй» паведаў аб тым, як услед за ратным подзвігам савецкі народ здзейсніў подзвіг працоўны, адрадзіўшы з попелу, з хаосу разрухі гарады і вёскі, фабрыкі і заводы, даўшы новае жыццё зямлі, перааранай вайной... Развіваючы творчы вопыт «Вялікай Айчыннай», стваральнікі новай кінаэпапеі раскрывалі біяграфіі сваіх дакументальных герояў на фоне шырокіх сацыяльна-гістарычных абагульненняў. На экране лёс чалавека прарастаў, можна сказаць, з біяграфіі краіны.

Два гэтыя серыялы — з'ява, безумоўна, самая прынцыповая ў савецкай кінадакументалістыцы. Аднак яе палітра далёка не вычэрпваецца рэтраспектыўнымі тэмамі. Так, вялікі грамадскі рэзананс атрымалі карціны рэжысёра Уладлена Трошкіна аб будаўніках Байкала-Амурскай магістралі (збудаванне гэтай чыгункі, ажыццяўляемае ў асноўным моладдзю, называюць у СССР «будоўляй веку»). Група Трошкіна адправілася на трасу ў Сібір разам з першым эшалонам маладых добраахвотнікаў. Дакументалісты разам з будаўнікамі абжывалі першы пасёлак на трасе — Зорны і знялі аб гэтым свой першы фільм «Даеш БАМ!». Стужкі Трошкіна — дзелавыя, праблемныя — расказваюць у першую чаргу не аб кіламетрах і іншай вытворча-хранікальнай атрыбутыцы, а аб характарах маладых людзей, што прыехалі ў Сібір будаваць не толькі дарогу, але, як паказвае экран, і ўласны лёс.

А вось яшчэ характэрны прыклад кінапубліцыстыкі, якая імкнецца не проста «фатаграфаваць» жыццё, а ўрывацца ў яго, дапамагаючы ў вырашэнні задач, што ставіць час. На Ленінградскай студыі дакументальных фільмаў была створана карціна, у аснову якой легла пісьмо ў газету. Яго аўтар — вопытны шафёр — востра ставіў пытанні дрэннай арганізацыі выкарыстання транспарту на будоўлях. Рэжысёр Міхаіл Сярэбранікаў сеў разам з ім у машыну... У выніку нарадзіўся фільм «Пісьмо ў газету», які не толькі зрабіў уплыў на работу транспарту, але — і гэта вельмі важна — пазнаёміў гледачоў з незвычайным чалавекам, які з поўным правам адчувае сябе гаспадаром у сацыялістычным грамадстве.

Вернасць тэме, свайму герою, як правіла, прыносіць значныя творчыя вынікі. Літоўскія рэжысёры Віктарас Старашас і Рымтаўтас Шылініс знялі фільм аб тым, як цэлы клас сельскай школы застаўся працаваць у калгасе. І вось праз 20 гадоў дакументалісты адшукалі сваіх герояў: на экраны выйшла карціна «Пасляслоўе да старога фільма». Плёнка дала магчымасць паставіць побач кадры, якія паказалі хлапчука, што ўступае ў жыццё, і яго ж — сталага мужчыну, ужо з сівізной на скронях. Паказаць юнацкі бляск вачэй і іх глыбіню, адзначаную сталасцю жыццёвага вопыту... Экран, як бы спрасаваўшы час, дазволіў глыбока задумацца аб многіх сацыяльных, маральных аспектах жыцця грамадства на канкрэтных чалавечых лёсах.

Убачыць гісторыю краіны ў лёсе аднаго чалавека — так бы я вызначыў звышзадачу працы, што нарадзілася ў выніку шматгадовай дружбы вядомага латышскага дакументаліста Герца Франка з вядомым старшынёй калгаса «Лачплесіс» Эдгарам Каўлінем. На працягу доўгіх гадоў здымаў дакументаліст Каўліня, прысвячаючы яму асобныя фільмы, вялікія эпізоды ў іншых карцінах. І сёння, калі славутага старшыні ўжо няма сярод жывых, у кінатэатрах краіны дэманструецца вялікі фільм аб Каўліні, сапраўдны кінараман аб яго доўгім цудоўным жыцці, аб высакароднай працы на зямлі. Помнікам старшыні засталіся калгас, у які ён уклаў сваё сэрца, і фільм, у які ўклаў сэрца дакументаліст.

Майстры многанацыянальнай савецкай кінадакументалістыкі імкнуцца паказаць на экране найбольш значныя, тыповыя рысы грамадскага клімату, якія часам факусіруюцца ў адной дэталі, невялікай падзеі, як у кроплі вады. «У госці да Джума-ага» — кароценькая, сціплая стужка, створаная туркменскім рэжысёрам Сапарам Маланіязавым. Але ўдумаемся ў яе змест: аматарскі тэатр плыве на баржы, рэпеціруе прама на плаву новы спектакль. Хто ж будучыя гледачы?.. Аказваецца, усяго толькі адзін чабан на далёкай адгоннай пашы. Ну і што з таго, што ён адзін (нібы разважае аўтар фільма ўслед за сваімі героямі), Джума-ага сумленна выконвае сваю справу далёка ў пустыні, і хіба ён не заслужыў, каб людзі парадавалі яго сваім шчырым цяплом, увагай?..

Уладзімір СІНЕЛЬНІКАЎ.

ТВОРЫ ПІСЬМЕННІКАЎ СССР — ПА-БЕЛАРУСКУ

НОВЫЯ ПЕРАКЛАДЫ

Штогод павялічваецца колькасць перакладаў на беларускую мову твораў пісьменнікаў народаў Савецкага Саюза. Сёлета, напрыклад, два беларускія выдавецтвы «Мастацкая літаратура» і «Юнацтва» выдадуць 15 кніг савецкіх аўтараў. Сярод іх — «Пад летнім небам» літоўца Вітаса Бубніса, «Жылюкі» украінца Міколы Алейніка, «Мары не паміраюць» эстонца Лео Метсара, «Высокае неба» таджыка Мірзо Турсун-задэ, «Гарачы камень» рускага Аркадзя Гайдара і іншыя.

Пятнаццаць кніг за год. На першы погляд гэта і нямнога, але толькі на першы. Справа ў тым, што амаль кожны беларус валодае рускай мовай — мовай міжнацыянальных зносін. І таму мае магчымасць прачытаць кнігі нацыянальных аўтараў у рускім перакладзе, у якім яны з'яўляюцца хутчэй і ў большай колькасці. Але адно — чытаць па-руску, другое — на роднай мове. Каб задаволіць прагную патрэбу беларуса ў знаёмстве са здабыткамі іншых літаратур, рэспубліканскія выдавецтвы штогод павялічваюць колькасць перакладных кніг. І ўсё ж надрукаваць усе творы пісьменнікаў, да якіх наш чытач праяўляе павышаную цікавасць, вельмі цяжка.

— Наша галоўная задача — расказвае загадчык рэдакцыі літаратуры народаў СССР выдавецтва «Мастацкая літаратура» пісьменнік Леў Салавей, — выдаваць самае лепшае, самае вартае. Дарэчы, выбіраць ёсць з чаго. Над перакладамі твораў пісьменнікаў нашай краіны працуе вялікі атрад перакладчыкаў як старэйшага, так і малодшага пакаленняў. Сярод іх можна назваць Янку Брыля, Янку Скрыгана, Ніла Гілевіча і многіх іншых. Пры адборы твораў мы кіруемся асноўным прынцыпам: яны павінны мець высокія мастацкія вартасці, быць цікавымі для чытача. Да прыкладу, вось толькі некалькі аўтараў, кнігі якіх у беларускім перакладзе з'явіліся ў нашых кнігарнях за апошнія 5—10 гадоў: К. Куліеў і С. Ясенін, І. Друцэ і Р. Гамзатаў, Ю. Марцінкявічус і Б. Алейнік, К. Федзін і Д. Кугульцінаў.

Задаволіць чытацкую патрэбу дапаможа і новы штогоднік «Братэрства», першы нумар якога выйдзе сёлета. Рыхтуюць яго Рыгор Барадулін і Галіна Шаранговіч. Многія творы «Братэрства»-82 прысвечаны Янку Купалу і Якубу Коласу з нагоды 100-годдзя з дня нараджэння песняроў. Іх аўтары — пісьменнікі і даследчыкі літаратуры братніх рэспублік.

Гаворачы пра пераклады твораў нацыянальных пісьменнікаў СССР, варта сказаць і пра тое, што кнігі беларусаў усё часцей перакладаюцца на мовы народаў Савецкага Саюза. Іх чытаюць ва ўсіх братніх рэспубліках. А пісьменнікаў Івана Мележа і Кандрата Крапіву, Васіля Быкава і Уладзіміра Караткевіча называюць у ліку любімых аўтараў у самых розных кутках нашай краіны.

Між іншым, імёны сучасных савецкіх пісьменнікаў, чые творы выдаюцца ў БССР, часта можна сустрэць сярод тых, хто перакладае з беларускай, хто ў сваёй рэспубліцы прапагандуе нашу літаратуру. Сярод іх Іван Бурсаў і Якаў Хялемскі — прапагандысты беларускай паэзіі ў Расіі, Альбінас Жукаўскас і Эўгеніюс Матузявічус — у Літве, Ульмас Умарбекаў — ва Узбекістане, Алім Кешокаў — у Кабардзіна-Балкарыі, Чынгіз Айтматаў — у Кіргізіі, Емяльян Букаў — у Малдавіі.

Мікола ШЭЛЯГОВІЧ.

З АПОШНІХ ВЕРНІСАЖАЎ



У Палацы мастацтва ў Мінску адкрыліся дзве выстаўкі літоўскіх мастачак Ганараты Размене і Элеаноры Шчэрбінскайтэ-Тункявічэне.

Ганарата Размене — вядомая ў Літве габеленшчыца. І, мусіць, не выпадкова сваю юбілейную выстаўку прывезла на паказ у братнюю рэспубліку. Сама некалі жыла на Віцебшчыне, тут упершыню ўбачыла, як ткуць вясковыя жанчыны дываны і посцілкі. Іх майстэрства зрабіла на яе вялікае ўражанне, абудзіла фантазію. І потым, ужо скончыўшы мастацкі інстытут, яна паспяхова выкарыстоўвае традыцыі беларускага і літоўскага народнага ткацтва ў сваёй творчасці.

Дываны, габелены і пано Г. Размене робіць з рознага матэрыялу, але перавагу аддае лёну, яго натуральнаму колеру, фактуры. Вельмі цікавыя, арыгінальныя па задуме работы мастачкі «Літоўка», «Альма матэр», «Май», мініяцюры «Вясна», «Дзяўчынка з гуссю», якія створаны ў стылі выпуклага, рэльефнага габелена.

Элеанора Шчэрбінскайтэ-Тункявічэне — майстар керамічнай пластыкі.

Прынята лічыць, што гліна — матэрыял мяккі і з яго, маўляў, усялякія дзівосы можна зрабіць. Аднак, відаць, нездарма раней толькі мужчыны «гаршкі ляпілі». Бо патрэбна для гэтага не толькі майстэрства, але і сіла ў руках.

Творы Э. Шчэрбінскайтэ-Тункявічэне даюць яркае ўяўленне аб іх аўтары, мяккай і пяшчотнай жанчыне, якая бачыць свет і прадметы ў ім вельмі гарманічнымі, адухоўленымі. Ансамблі прадметаў — своеасаблівыя кампазіцыі — як правіла, аб'ядноўваюцца адзінай пластычнай задумай, колернай гамай. Часам да той ці іншай вазы, скульптуры так і хочацца дакрануцца, каб упэўніцца, што гэта сапраўды гліна, а не іншы матэрыял, што набыў такую чароўна-пластычную форму. Дарэчы, многія створаныя мастачкай кампазіцыі — «Хустка», «8 Сакавіка», «Маленькі мак», «Эвалюцыя» — выклікаюць асацыяцыі з лірычнымі вобразамі прыроды.

НА ЗДЫМКАХ: работы Э. ШЧЭРБІНСКАЙТЭ-ТУНКЯВІЧЭНЕ; габелен «Чаканне» Г. РАЗМЕНЕ.

У век стандартызацыі ўсё незвычайнае асабліва прыцягвае ўвагу, таму вялікай папулярнасцю ў мінчан і гасцей сталіцы карысталася першая гарадская выстаўка аматарскай тэхнічнай творчасці, якая была арганізавана абласным саветам прафсаюза, міжсаюзным Домам самадзейнай творчасці і Мінскім абласным саветам УТВР (Усесаюзнае таварыства вынаходнікаў і рацыяналізатараў).

І вось я пераступаю парог выставачнай залы Беларускага навукова-даследчага інстытута навукова-тэхнічнай інфармацыі Дзяржплана БССР. Чаго тут толькі няма! Антыкварныя аўтамабілі, машына, зробленая з двух мапедаў пад назвай «Калабок», яна і знешнім выглядам, і афарбоўкай нагадвае яго, мапед-малютка, не вышэйшы за дзіцячы веласіпед, дэльтаплан, касілка для стрыжкі газонаў, чыгунка, мадэлі караблёў і станкоў і шмат іншых цікавых рэчаў.

Часцей за ўсё тут можна бачыць школьнікаў, якія прыходзяць цэлымі класамі і, як зачараваныя, глядзяць на гэтыя «цуды». Напэўна, пасля наведвання выстаўкі многія хлопчыкі і дзяўчынкі будуць займацца ў Палацах піянераў і школьнікаў, у гуртках тэхнічнай творчасці пры домакіраўніцтвах, каб самім будаваць такія ж цудоўныя станкі і макеты: караблёў. Я сустрэўся з адным з удзельнікаў выстаўкі, аўтарам «Калабка», макетчыкам аднаго з навукова-даследчых інстытутаў Леанідам Каберавым і папрасіў яго расказаць пра сваю машыну.

— Працаваў я над сваім «Калабком» два гады. Прачытаў шмат спецыяльнай літаратуры. І вось атрымалася двухмесная машына, якая развівае хуткасць да 90 кіламетраў у гадзіну, абышлася яна мне шэсцьсот рублёў.

У кнізе водгукаў (у адной не хапіла месца, дык іх дзве) сотні меркаванняў пра выстаўку, і ў кожным ёсць пажаданне бачыць такія выстаўкі часцей.



НА ЗДЫМКАХ: у зале выстаўкі; аўтар «Калабка» Л. КАБЕРАЎ; каля мадэлі процілапажарнага судна.

Святаслаў КРЫЦКІ.
Фота аўтара.

НА «БІС» ВЫКЛІКАЮЦЬ «ПЕЎНІКАЎ»

Хто ў дзяцінстве не марыў стаць музыкантам! Але ж які доўгі шлях да музыкі: бясконцыя гамы, сальфеджыо, аднастайныя практыкаванні... Здараецца, няма калі нават у хакей пагуляць, сустрэцца з сябрам. Многім прыходзіцца ахвяраваць дзеля таго, каб навучыцца іграць на скрыпцы або трубе.

— Шлях да авалодання музычнымі інструментамі ляжыць праз выхаванне ў дзяцей харавой культуры, — пераканана гаворыць кіраўнік узорнага харавога калектыву хлопчыкаў «Пеўнікі» Брэсцкай музычнай школы Людміла Карабейнікава. — У любой дзейнасці самы моцны стымул — канчатковы вынік. А ў музычнай школе, ды яшчэ калі інструмент складаны, ён адцягнуты на гады. Але вучні, што спяваюць у хоры, ужо праз месяц бачаць плён сваёй працы, рэакцыю слухачоў. Гэта дае пэўнае адчуванне перспектывы ў авалоданні музычным інструментам.

Менавіта таму ў школе сем гадоў назад быў створаны хор з задзірлівай назвай «Пеўнікі», у склад яго ўвайшлі сорак хлопчыкаў.

«Пеўнікі» згуртоўваліся не толькі на сцэне. Акрамя доўгіх рэпетыцый, былі яшчэ цікавыя лекцыі пра музыку і вялікіх музыкантаў і кампазітараў, праслухоўванні запісаў славутых хораў. Вольны час хлопчыкі таксама праводзілі разам: хадзілі на канцэрты, святкавалі дні нараджэння. А летам на канікулах усе разам адпачывалі ў піянерскім лагеры, дзе нават выдавалі сваю насценную газету «Звонкія галасы».

Першыя выступленні прынеслі «Пеўнікам» поспех. Іх вельмі палюбілі брэстчане, ласкава назвалі галасістымі пеўнічкамі. Нездарма ў 1976 годзе яны сталі лаўрэатамі рэспубліканскага конкурсу харавых калектываў музычных школ. Але сапраўдным «адкрыццём» «Пеўнікаў» было іх выступленне на Усесаюзным злёце харавых калектываў хлопчыкаў у Кіеве. Тады пра іх пісалі газеты, дзіцячыя часопісы.

Шырокая вядомасць, поспех, прызнанне не ўскружылі галовы маленькім артыстам. Яны працягвалі ўпарта і настойліва працаваць.

Цяпер у хоры дзве групы. У першай, канцэртнай, займаецца 60 хлопчыкаў, у другой — кандыдацкай — робяць першыя крокі самыя юныя, першакласнікі. Узрост удзельнікаў наогул самы розны. Што, дарэчы, і надае хору своеасаблівасць і арыгінальнасць гучання. Але гэтая ж самая розніца ва ўзросце ўдзельнікаў хору мае і адваротны бок. Малодшыя спевакі пастаянна пераходзяць у першы дыскант, другія дысканты — у альты. З улікам гэтага створана юнацкая група, у якой спяваюць мутанты. Калі іх галасы ўзмоцняцца, вызначацца ў тэмбравых адносінах, яны ўліваюцца ў канцэртную групу.

Не так даўно я сустрэўся з удзельнікамі дзіцячага хору, пабываў на рэпетыцыях і канцэртах, пагутарыў з хлопчыкамі. І ўпэўніўся, што калектыў нездарма назвалі «Пеўнікі». Уяўляеце маладзенькіх пеўнікаў? Галасы ў іх звонкія, чыстыя. Збяруцца разам, нешта не падзеляць — і бойка. Толькі пер'е лятае ў паветры. Так і хлопчыкі. У нечым нагадваюць пеўнікаў. Такія ж нястрымныя, часам гарэзлівыя ў гульнях. І раптам пераўвасабляюцца, калі падыходзіць час рэпетыцыі — становяцца сур'ёзнымі і засяроджанымі. Адзін узмах рукі Людмілы Аляксандраўны — і ў цішыні загучыць мелодыя... Якая? Вельмі ўдала выконваюць юныя спевакі песню беларускага кампазітара Г. Вагнера «Хлапчукі бессмяротнага Брэста», што стала іх своеасаблівай «візітнай карткай», беларускія народныя песні, рускую народную песню «Уніз па матухне па Волзе», творы Чайкоўскага, Моцарта, Баха, Штрауса.

З вельмі цікавай, арыгінальнай праграмай выступілі «Пеўнікі» летась на Пеўчым полі ў эстонскім горадзе Тарту. Але, бадай, самай адказнай і ганаровай сцэнай для іх з'яўляецца вялікая эстрада Брэсцкага парку культуры і адпачынку. Глядзець іх выступленні прыходзяць бацькі, сябры, аднакласнікі і настаўнікі.

У ліпені хор хлопчыкаў зноў адправіцца ў падарожжа — на Усесаюзнае свята харавога мастацтва ў Талін. І цяпер рыхтуе новую праграму, у якую ўвойдуць песні савецкіх кампазітараў аб міры і сяброўстве паміж дзецьмі ўсіх краін.

М. КАЗЛОВІЧ.

Спорт

ІГАР КАНЫГІН

На мінулым першынстве Еўропы па класічнай барацьбе ў вагавай катэгорыі да 90 кілаграмаў у рашаючым паядынку сустрэліся швед Франк Андэрсан і віцябчанін Ігар Каныгін. Тады перамог савецкі асілак.

І на гэты раз галоўную ўзнагароду чэмпіяната кантынента, які нядаўна завяршыўся ў балгарскім горадзе Варна, разыгралі старыя знаёмыя. Гэты цікавы паядынак ізноў завяршыўся перамогай беларускага барца.

У камандным заліку першынствавала зборная СССР.

...І АНТОН НОВІК

Летась на чэмпіянаце Савецкага Саюза армеец з Мінска Антон Новік упершыню заваяваў залаты медаль па барацьбе самба і быў уключаны ў склад зборнай краіны. А цяпер беларускі самбіст вызначыўся і на першынстве Еўропы, якое прайшло таксама ў Варне. У вагавай катэгорыі да 100 кілаграмаў ён атрымаў перамогу.

СССР — ГДР

У Маскве ў басейне Алімпійскай вёскі завяршыўся традыцыйны матч юнацкіх зборных СССР — ГДР па скачках у ваду.

Спаборніцтвы выйгралі савецкія спартсмены. У складзе пераможцаў і беларускія юнакі: В. Семянько, А. Стасюлевіч і А. Гладчанка.

НА ТУРНІРЫ Ў КІЕВЕ

На міжнародным турніры «Кіеўская рапіра» зноў наперадзе зборная СССР. Нашы фехтавальшчыкі ў фінальным паядынку перамаглі польскіх спартсменаў.

За зборную каманду Савецкага Саюза выступаў неаднаразовы чэмпіён Алімпійскіх гульняў, свету, кантынента і краіны мінчанін Аляксандр Раманькоў.

Яшчэ не завяршылася першынство па хакею, а ўжо пачаўся чэмпіянат краіны па футболу. Але спартсмены не пакрыўджаны: і на хакейным, і на футбольным матчах заўсёды шмат гледачоў.

НА ЗДЫМКАХ: сустрэча па хакею паміж камандамі «Дынама» (Мінск) — «Дызеліст» (Пенза); пры перапоўненых трыбунах праходзіў матч «Дынама» (Мінск) — «Дынама» (Масква). У гэтым паядынку перамаглі беларускія футбалісты — 1:0.

Фота М. ХАДАСЕВІЧА.

Гумар

— Скажы, Міні, ты мне тры месяцы казад прадставіла аднаго маладога чалавека ў якасці свайго жаніха. Калі ж у вас вяселле?

— Думаю, што хутка, цёця. Але не адначасова.

●

Сярод ночы жонка будзіць мужа:

— Прачніся! Што здарылася? Чаму ты крычыш?

— Мне прыснілася Марыя...

— Марыя? Хто такая Марыя?

— Ты яе не ведаеш... Мы пазнаёміліся ў сне...

●

— Ці ведаеце, мадам, вы збілі за тыдзень пяцярых прахожых! Гэта ўжо занадта!

— А колькі можна?

●

У час спірытычнага сеанса жанчына выклікае дух свайго мужа, які нядаўна памёр, і пытаецца:

— Ці лепш табе зараз, чым тады, калі ты жыў са мной?

— Так.

— А дзе ты знаходзішся?

— У пекле...

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ

НАШ АДРАС:
МІНСК-ГСП, ЛЕНІНСКІ ПРАСПЕКТ, 44.
ТЭЛЕФОНЫ: 33-01-97, 33-02-80, 33-03-15, 33-16-56, 33-07-82

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.
Зак. 859.